*bank-financial-intermediation-2022/. - Date of asses : 15.04.2023 3. Хмыз, О. В. Проблемы реформирования мировой валютно-финансовой архитектуры / О. Хмыз // Экономика. Налоги. Право. – 2016. – № 2. – С. 30-35. 4. Why Not Bancor? Keynes's Currency Plan as a Solution to Global Imbalances / Oxford Academic [Electronic resourse]. - 2013 - Mode of asses : https://academic.oup.com/book/35368/chapter-abstract/301076908 - Date of asses :15.05.23. 5. Currency composition of official foreign exchange reserves / International Monetary Fund data / [Electronic resourse]. – 2023 - Mode of asses : https://data.imf.org/?sk=e6a5f467-c14b-4aa8-9f6d-5a09ec4e62a4 - Date of asses :11.07.2023. 6. H. Perez-Saiz, Ms. Longmei Zhang. Renminbi Usage in Cross-Border Payments. - IMF eLIBRARY / [Electronic resourse]. - 2023 - Mode of asses : https://www.elibrary.imf.org/view/journals/001/2023/077/article-A000-en.xml - Date of asses : 11.07.2023. 7. Gold Demand Trends Full Year 2022 / World Gold Council [Electronic resourse]. - 2022 - Mode of asses : https://www.gold.org/goldhub/research/gold-demand-trends/gold-demand-trends-full-year-2022/central-banks - Date of asses : 30.07.2023. 8. Соловьева, О. Возможна ли валюта БРИКС без участия Индии / Независимая газета /[Электронный ресурс]. – 11.07.2023 - Режим доступа : https://www.ng.ru/economics/2023-07-11/1_8770_india.html - Дата доступа :27.08.2023*

УДК 947.6
**ЮРГЕВІЧ Н. К.,** канд. гістар. навук, дацэнт
*УА «Віцебская ордэна «Знак Пашаны» дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны», г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*

## ПРАБЛЕМЫ РАЗВІЦЦЯ АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНАЙ ШКОЛЫ Ў БССР У СЯРЭДЗІНЕ 1950-Х – ПАЧАТКУ 1960-Х ГГ. УВЯДЗЕННЕ ПОЛІТЭХНІЧНАГА НАВУЧАНННЯ

***Рэзюмэ.*** *Развіцце агульнаадукацыйнай школы ў Беларускай ССР у сярэдзіне 1950-х – пачатку 1960-х гг. характарызуецца спробамі шматлікіх рэформ і рэарганізацый з боку дзяржавы. Аднак эканамічныя цяжкасці пасляваенных гадоў, недастатковае фінансаванне, слабая матэрыяльна-тэхнічная база школ краіны адмоўна ўплывалі на выкананне задач.*

***Ключавыя словы***: *агульнаадукацыйная школа, сярэдняя адукацыя, настаўніцкія кадры, усенавуч, політэхнічнае навучанне.*

**Уводзіны.** Значная роля ў культурным развіцці БССР у пасляваенныя гады надавалася развіццю агульнаадукацыйнай школы. У 1950 г. у рэспубліцы працавалі 12715 школ (у 1941 г. іх было 12294), у якіх навучалася 1555,2 тыс. вучняў, працавалі 64,4 тыс. настаўнікаў, 29 (да вайны 25) вышэйшых і 107 (да вайны 128) сярэдніх спецыяльных устаноў

[8, с. 428-479]. Метад народнай ініцыятывы і станоўчы вопыт па вывядзенні школьных будынкаў з прыстасаваных для вучэбных мэт памяшканняў у асабістыя быў выкарыстаны і ў 1950-я гг. [6, арк. 13]. Калі ў 1951-1958 гг. за кошт дзяржбюджэта ў БССР былі пабудаваны 372 новыя школы, то калгасамі – 2,3 тыс. школ. З 1953 г. для падтрымкі народнай ініцыятывы кіраўніцтва БССР выдзяляла сродкі для школ, якія будаваліся калгасамі, на аплату будаўнічых матэрыялаў і абсталявання [3, с. 32].

**Матэрыялы і метады даследавання.** Пры правядзенні даследавання выкарыстоўваліся працы вучоных, афіцыйныя дакументы цэнтральных і рэспубліканскіх партыйных і дзяржаўных органаў, матэрыялы архіваў Рэспублікі Беларусь, статыстычныя зборнікі. У працы выкарыстоўваліся агульнанавуковыя (аналіз, сінтэз, параўнанне, абагульненне) і спецыяльна-гістарычныя метады: гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-сістэмны.

**Вынікі даследавання.** У 1950-я гг. у БССР пачынаецца паступовы рост сямігадовых і сярэдніх школ. Колькасць навучэнцаў 8-10 класаў толькі ў беларускай весцы павялічылася ад 5,3 тыс. чалавек у 1945–1946 гг. да 124,1 тыс. у 1955–1956 гг. [4, с. 409]. Станоўчым момантам стала адмена ў 1956 г. платы за навучанне ў старэйшых класах школ рэспублікі. Так, звыш 70% вучняў, якія закончылі ў 1956 г. семыя класы, у 1956-1957 навучальным годзе працягвалі вучобу далей у сярэдніх школах альбо тэхнікумах рэспублікі. Аднак у канцы 1950-х гг. сямігадовых і сярэдніх школ у БССР, асабліва ў сельскай мясцовасці, было яшчэ недастаткова, некаторыя з іх знаходзіліся на значнай адлегласці ад месца пражывання вучняў. Эканамічныя цяжкасці, беднасць многіх сем’яў, праца па хатняй гаспадарцы, у калгасе і інш. не дазвалялі органам народнай адукацыі вырашыць пытанне аб усеагульным навучанні дзяцей школьнага ўзросту.

Яшчэ адным мерапрыемствам у пачатку 1950-х гг. стала ўвядзенне політэхнічнага навучання ў агульнаадукацыйных школах БССР. Якім павінна было стаць політэхнічнае навучанне і што павінен быў умець выпускнік сярэдняй школы, на працягу 1950-х гг. мянялася. Так, у дакладной запісцы міністра адукацыі РСФСР І.А. Каірава ад 25 лютага 1953 г. адзначалася, што політэхнічнае навучанне павінна было паказаць ролю навукі ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы, даць вучням “общее представление о современном производстве и его основных элементах”, а таксама прывіць вучням “некоторые умения и навыки, необходимые для будущей практической деятельности” [1, с. 3]. Такім чынам, політэхнічнае навучанне разглядалася спосабам падрыхтоўкі да выбару будучай прафесійнай дзейнасці, магчымасцю для вучняў, якія не паступілі пасля заканчэння сярэдняй школы ў ВНУ, тэхнікум, працаўладкавацца, напрыклад, у калгас, прадпрыемства і іншую арганізацыю.

Увядзенне політэхнічнага навучання ў школах прадугледжвала ручную працу для вучняў у 1-4 класах, практычныя заняткі ў 5-7 класах, а

ў 8-10 класах - практыкумы па асновах электратэхніцы, сельскай гаспадарцы, машынабудавання і г.д. Пры школах ствараліся майстэрні, ім выдзяляліся зямельныя ўчасткі, вучні штогод павінны былі праходзіць сельскагаспадарчую практыку. Планавалася правядзенне экскурсій у калгасы, МТС, на прадпрыемствы і перадача апошнімі спісанай тэхнікі і абсталявання для школ [1, с. 2-3]. Пэўныя поспехі былі адзначаны ў працы беларускіх школ, вопыт якіх рэкамендавалася пераймаць іншым навучальным установам. У загадзе міністра адукацыі БССР № 287 ад 20 жніўня 1955 г. «Об опыте работы школ Могилевской области по ознакомлению учащихся с основами производства и привитию им практических навыков с помощью предприятий, колхозов и МТС» адзначаліся Бярозкаўская сярэдняя школа Хоцімскага раена, сярэднія школы № 7, 9, 11 г. Магілева, вучні якіх дапамагалі калгасам вырошчваць і ўбіраць буракі, кукурузу, наведвалі з экскурсіямі цэхі заводаў па асобных тэмах па фізіцы і хіміі, выконвалі на станках простыя аперацыі. Станоўча была ацэнена ў 1955 г. праца Рубенскай сярэдняй школы і калгаса «Сцяг камунізму» Давыд-Гарадзенскага раена Мінскай вобласці. Штогод прыкладна 400 вучняў у дні канікул працавалі ў калгасе, выпрацоўваючы 70-80 працадзен. Вучні працавалі на ферме, удзельнічалі ў зборы насення, бульбы і інш. А калгас выдзеліў школе на набыцце наглядна-вучэбных дапаможнікаў і абсталявання 15 тыс. рублеў, аўтамабіль для заняткаў па аўтамабілезнаўству і спецыяліста [ 5, арк. 7].

Аднак матэрыяльная база школ у канцы 1950-х – пачатку 1960-х гг. не заўседы адпавядала пастаўленым задачам і патрабаванням: часта не хапала памяшканняў, абсталявання, спецыялістаў для працы з дзецьмі, у школах нярэдка адсутнічалі электрычнасць, мэбля, патрэбны запас дроў для ацяплення школы ў асенне-зімовы перыяд, падручнікі, сшыткі і вучэбныя прылады. У некаторых населеных пунктах актуальным заставалася пытанне аб пераводзе школ з наемных непрыстасаваных памяшканняў у асабістыя, капітальным рамонце будынкаў, працы школы ў некалькі змен. Так, ацэньваючы падрыхтоўку школ БССР да 1954-1955 навучальнага года, ЦК КПБ указваў на тое, што мясцовыя органы не могуць выкарыстаць выдзеленыя на набыцце наглядных дапаможнікаў і абсталявання сродкі ў поўнымаб’еме, так як патрэбныя тавары адсутнічалі на складах [1, с. 3].

Аналіз матэрыялаў сведчыць пра тое, што поспехаў у здзяйсненні політэхнічнага навучання ў 1950-я гг. дабіваліся часцей гарадскія школы, матэрыяльна-тэхнічная база якіх дазваляла арганізаваць майстэрні, вытворчыя экскурсіі для дзяцей, супрацоўніцтва настаўнікаў з Палацамі піянераў і станцыямі юнатаў. Толькі ў паловы сельскіх школ і школ невялікіх гарадоў у 1952-1957 гг. функцыянавалі майстэрні (напрыклад, толькі ў 191 з 330 сямігадовых школ Віцебскай вобласці). Тым не менш, у 1956-1957 вучэбным годзе па новым планам працавала 136 школ з

політэхнічным навучаннем, у 1957-1958 гг. – 500, у школах былі створаны 3104 майстэрні па апрацоўцы дрэва і метала, 373 кабінета машыназнаўства і электратэхнікі, існавалі кабінеты фізікі, хіміі, біялогіі [3, с. 31, с. 48].

У снежні 1958 г. у БССР быў пакладзены пачатак рэформ, якія прадугледжвалі здзяйсненне політэхнічнага і працоўнага навучання і ўмацаванне іх узаемасувязі. У 1958 г. у адпаведнасці з Законам «Аб умацаванні сувязі школы з жыццем і аб далейшым развіцці сістэмы народнай асветы ў СССР» у краіне замест усеагульнага сямігадовага навучання ўводзілася васьмігадовае, а ў сярэдняй школе – адзінаццацігадовы тэрмін з абавязковым вытворчым навучаннем. На працягу некалькіх гадоў ва ўсіх сярэдніх і большасці васьмігадовых школ краіны адкрываліся майстэрні больш чым на 100 тыс. вучэбных месцаў. Прадугледжвалася і пашырэнне сеткі вячэрніх і завочных школ, распрацоўка і ўвядзенне ўдасканаленых вучэбных планаў, праграм, падручнікаў, умацаванне вучэбна-матэрыяльнай базы школы. Як станоўчы момант, можна адзначыць працу школ-інтэрнатаў. Першыя сем такіх устаноў у рэспубліцы з'явіліся ў 1956 г. [8, с. 166]. Маламаемасныя сем'і і ў якіх адсутнічаў хто-небудзь з бацькоў атрымалі магчымасць за невялікую плату вучыць дзяцей у школе. Нягледзячы на тое, што некаторыя школы-інтэрнаты закрываліся па прычыне недастаткова прадуманай арганізацыі па харчаванні дзяцей і слабасці матэрыяльнай базы, аднак, паступова праблемы вырашаліся і колькасць школ-інтэрнатаў павялічвалася: да пачатку 1965 г. у рэспубліцы працавала 120 школ-інтэрнатаў, у якіх вучылася каля 41 тыс. дзяцей [ 5, арк. 7-10].

Падобны па зместу дакумент быў прыняты 8 красавіка 1959 г. на сесіі Вярхоўнага Савета БССР. Галоўнай мэтай рэформы была аб'яўлена падрыхтоўка адукаваных людзей, «хорошо знающих основы наук и вместе с тем способных к систематическому физическому труду», тэхнічна адукаваных кадраў для прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Прадугледжваліся два дні ў тыдзень, калі школьнікі старэйшых класаў дзенных школ павінны былі працаваць на прадпрыемствах ці ў сельскай гаспадарцы. У выніку, выпускнікі сярэдняй школы разам з атэстатам сталасці атрымоўвалі атэстат аб спецыяльнасці. У 1958 г. у Гарадзейскай сярэдняй школе Нясвіжскага раена рыхтавалі трактарыстаў і камбайнераў, у Пяражыйскай школе Рудзенскага раена – садаводаў, гародневодаў, жывелаводаў. Вучні СШ № 1 і № 3 г. Оршы праходзілі практыку на станкабудаўнічым заводзе і заводзе швейных машын, яны атрымлівалі спецыяльнасць токара, фрэзероўшчыка і заставаліся тут працаваць пасля заканчэння школы [3, с. 49, с. 31].

Дзейсную дапамогу ўстановы адукацыі атрымлівалі ад калектываў прадпрыемстваў і арганізацый. У 1962-1963 гг. у школах БССР меліся 662 майстэрні па апрацоўцы металу, 1166 – па апрацоўцы дрэва, 3098 – камбінаваных, 458 – швейных і 125 іншага прызначэння [2, с. 311]. Да

1963-1964 навучальнага года ўсе сярэднія школы былі поўнасцю ператвораны ў школы з вытворчым навучаннем. Так, вучні сярэдніх школ Віцебска і Віцебскай вобласці маглі атрымаць падрыхтоўку па спецыяльнасцям «ткач», «электрык-механік», «слесар» (Віцебскі дывановы камбінат, Аршанскі льнокамбінат), «швачка» (Полацкая швейная фабрыка), «палявод», «жывелавод», «трактарыст», «механізатар», «садавод-агароднік» (калгасы імя Калініна, «Прагрэс»). Асвоеная прафесія ў школе станавілася для некаторых выпускнікоў асноўнай у жыцці.

Аднак праблем па развіцці школ хапала і ў 1960-я гг. Прыкладам можа быць прыведзеная пастанова прэзідыўма Віцебскага абласнога савета прафсаюзаў «О неудовлетворительном состоянии техники безопасности и производственной санитарии в учебных мастерских школ области» (1961 г.), у якой канстатавалася, што ўмовы працы школьнікаў не адпавядаюць санітарна-гігіенічным патрабаванням, «помещения мастерских (школы № 1, 6, 25 г. Витебска, № 3 г. Полоцка) размещены в подвальных помещениях без достаточного естественного освещения, сырые, стены покрыты плесенью. Отсутствуют проходы между верстаками. Часть оборудования неисправна… Нет вытяжной вентиляции, умывальников, мыла, полотенец, спецодежды для школьников, аптечек» [1, с. 5-6].

Скіроўваючы галоўную ўвагу на ўмацаванне сувязей школы з практычным жыццем, паглыбленне ў ей прынцыпу політэхнізацыі, педагагічныя калектывы сталі клапаціцца аб тым, каб дзеці атрымлівалі глыбокія веды па ўсіх прадметах. У школах працавала нямала таленавітых настаўнікаў, вучыліся дзеці, якія вызначаліся высокай агульнаадукацыйнай падрыхтоўкай.

З сярэдзіны 1960-х гг. у БССР пачаўся пераход да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі. Паступова павялічвалася колькасць сярэдніх школ, паляпшалася іх забяспечанасць абсталяваннем і вучэбнымі прыладамі. У 1964 г. школы зноў былі пераведзены на дзесяцігадовы тэрмін навучання (да 1984 г.). Колькасны рост агульнаадукацыйных школ БССР захаваўся і склаў у 1965-1966 навучальным годзе 13000 школ [4, с. 428]. Да сярэдзіны 1960-х гг. вытворчае навучанне ў многіх школах БССР было адменена,а з 1966 г. прафесійная падрыхтоўка стала неабавязковай.

**Заключэнне.** Поспехі, дасягнутыя беларускім народам ў пасляваенныя гады ў развіцці эканомікі, дазволілі ў кароткі тэрмін аднавіць школьную сетку, стварыць неабходную матэрыяльную базу, падрыхтаваць кадры кваліфікаваных педагогаў. Нягледзячы на неймаверныя цяжкасці пасляваеннага перыяду, у хуткім часе адбыўся пераход ад пачатковага да сямігадовага навучання дзяцей. Вяліся настойлівыя пошукі ўдасканалення працэса навучання і выхавання ў сярэдняй школе. Нядрэннай справай з’яўлялася ўвядзенне політэхнічнага навучання ў вучэбны працэс агульнаадукацыйных школ, для некаторых маладых людзей гэта быў шанс для атрымання спецыяльнасці на ўсе

жыцце. Аднак па прычыне недастатковага фінансавання і слабай матэрыяльна-тэхнічнай базы школ політэхнічнае навучанне ў сярэдзіне 1960-х гг. было спынена.

***Літаратура.*** *1. Бездель, В. Е. Политехническое обучение в школах БССР в 50-е гг. 20 в. / В. Е. Бездель // Вестник Полоцкого государственного университета. – 2021. - № 7. С. 2-6. 2. Гісторыя Беларусі: у 6-ці т. Т. 6. Беларусь у 1946-2009 гг. / Л. Лыч [і інш.]; рэд.кал.: М. Касцюк [і інш.]. – Мінск, 2011. – 728 с. 3. Культурное строительство в БССР (1946-1958 гг.) / А. П. Врублевский [и др.]; редкол.: И. Е. Марченко [и др.]. – Минск, 1979. – 220 с. 4. Народное хозяйство БССР: стат. сборник / ред.: П. Голубцова. – Минск, 1963. – 511 с. 5. Отчеты Облоно о работе школ Минской области за 1950-1951 учебный год // Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці. – Фонд 1243. – Воп. 1. – Спр. 45. 6. Постановления и директивные указания вышестоящих органов по вопросу народного образования. 26.01.1953 – 8.12.1953 гг. // Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. – Фонд 2797. – Воп. 2. – Спр. 3. 7. Протоколы Совета Министров 1955 г. // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Фонд 42. – Воп. 4. – Спр. 106. 8. Рост материального благосостояния и культуры белорусского народа. – Минск, 1969 г. - 305 с.*

УДК330.47

**ЦЗИ ЛИН**, преподаватель колледжа
*Гуанчжоуский технологический колледж, кафедра экономики и менеджмента, Гуанчжоу, Китайская Народная Республика*

## ИССЛЕДОВАНИЕ ПО ОПТИМИЗАЦИИ МЕТОДИКИ ОБУЧЕНИЯ АНАЛИЗУ ФИНАНСОВЫХ ДАННЫХ В ПРОЦЕССЕ ПОДГОТОВКИ БУДУЩИХ ЭКОНОМИСТОВ

***Резюме.*** *В последние годы многие колледжи и университеты открыли курсы по интеллектуальному анализу финансовых данных, целью которых является помочь студентам-финансистам эффективно обрабатывать финансовые данные с помощью компьютерных технологий. Вместе с тем, в методике преподавания данного курса все еще имеются отдельные недостатки. В данной статье рассматривается реально используемая методика обучения, в которой предложены меры по оптимизации процесса обучения.*

***Ключевые слова:*** *анализ финансовых данных, методика обучения, оптимизация процесса обучения.*

**JI LING,** college teacher
*Guangdong Technology College, Department of Economics and Management, Guangdong, China*